# Краязнаўчая бібліяграфічная работа публічных бібліятэк

СВЯТЛАНА ЗЫГМАНТОВІЧ, ВАЛЯНЦІНА САІТАВА

***Бягучае дзесяцігоддзе ў дзейнасці публічных бібліятэк нашай краіны характарызуецца сапраўдным уздымам краязнаўчай работы.***

Гэта дасягненне правамерна звязваюць з нацыянальнымі, культурнымі і сацыяльна-палітычнымі фактарамі, якія выклікалі шырокі грамадскі рух па вывучэнню гісторыка-культурнай спадчыны, адметнасці мясцовага насельніцтва і ладу жыцця, удзелу жыхароў у фарміраванні сучасных форм гаспадарчых, палітычных, культурных, сацыяльна-бытавых і іншых адносін. Яшчэ больш значную ролю ў паспяховым развіцці краязнаўчага накірунку дзейнасці бібліятэк адыгралі бібліятэкары-бібліёграфы. Мэты краязнаўчай работы былі глыбока асэнсаваны многімі з іх і паслядоўна рэалізаваліся ў паўсядзённай руплівай працы па збору, арганізацыі і выкарыстанню унікальнай краязнаўчай інфармацыі. Сярод выдатных арганізатараў краязнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк славутыя імёны Р.М.Чыгіровай, А.У.Гатоўскай і іншых спецыялістаў.

Уздым краязнаўчай работы аб'ектыўна спрыяе ўмацаванню ролі публічнай бібліятэкі як сацыяльна-культурнай і інфармацыйнай установы. Мы бачым у краязнаўчай інфармацыйнай і культурна-асветніцкай дзейнасці адзін з асноўных накірункаў, развіваючы які публічная бібліятэка ўпісваецца ў нацыянальную інфармацыйную інфраструктуру ў якасці адмысловага звяна. Гэта сцвярджэнне адпавядае абвешчанаму ў "Маніфесце ЮНЕСКО аб публічных бібліятэках. 1994" палажэнню аб ролі публічных бібліятэк як інфармацыйных цэнтраў рэгіёна, які яны абслугоўваюць.

Становішча інфармацыйнага цэнтра невялікіх рэгіёнаў ставіць перад публічнымі бібліятэкамі дзве асноўныя задачы:

— забеспячэнне доступа грамадзян да ўсіх відаў мясцовай інфармацыі;

— забеспячэнне доступа да інфармацыйных рэсурсаў, якія адлюстроўваюць культурныя здабыткі краіны, усяго чалавецтва.

Збор, апрацоўка і арганізацыя выкарыстання ўсёй мясцовай інфармацыі з'яўляецца важнейшым накірункам у дзейнасці публічных бібліятэк высокаразвітых заходніх краін. Такая інфармацыя патрэбна насельніцтву рэгіёна для вучобы, эканамічнай і палітычнай дзейнасці, навуковых даследаванняў, творчасці, адпачынку. Цікавяцца ёю школьнікі, студэнты, педагогі, прадстаўнікі розных прафесій, дзелавыя людзі, мясцовыя кіраўнікі, пенсіянеры, хатнія гаспадыні.

Перспектывы інфармацыйнай работы публічных бібліятэк нашай краіны таксама залежаць ад стану і ўмоў прадастаўлення мясцовых інфармацыйных рэсурсаў. Многія ЦБС адчулі патрэбу ў зборы мясцовых афіцыйных матэрыялаў, гістарычных дакументаў, АВ-дакументаў, матэрыялаў, якія адлюстроўваюць этнічную, моўную, рэлігійную ці бытавую аўтэнтычнасць насельніцтва, разнастайных фактычных даных. У ЦБС ствараюцца цэнтры афіцыйнай, дзелавой, экалагічнай інфармацыі і іншыя цэнтры і куткі, асабліва важнае месца ў якіх павінны займаць краязнаўчыя мясцовыя матэрыялы. Пажадана, каб бібліятэкі выявілі ўсе крыніцы фарміравання мясцовых дакументаў, прыклалі намаганні для магчыма поўнага і сістэматычнага іх набыцця і давядзення да карыстальнікаў.

Важнае значэнне для шэрага ЦБС набыў пошук краязнаўчых друкаваных дакументаў у музеях, архівах, другіх бібліятэках вобласці і краіны, у прыватных кнігазборах. Вынікам гэтай работы з'яўляецца не толькі стварэнне новых бібліяграфічных запісаў, але і пошук асобнікаў ці набыцце копій. Прыкладам падобнай дзейнасці можа быць Барысаўская ГЦБС. Для ўсіх беларускіх публічных бібліятэк пошук краязнаўчых дакументаў па-за межамі ўласнага рэгіёна захоўвае асаблівую актуальнасць з прычыны шматлікіх адмоўных фактараў, вытокі якіх у трагічных абставінах мінулага беларускай культуры.

Назапашаныя і новыя краязнаўчыя дакументы патрабуюць магчыма поўнага і даступнага бібліяграфічнага адлюстравання. Менавіта сёння інфармацыйны патэнцыял публічных бібліятэк пачаў ацэньвацца не толькі колькаснымі паказчыкамі стану фонду, але і паўнатой, камфортнасцю даведачнага апарата. Паколькі ў абсалютнай большасці ЦБС рэспублікі захоўваюцца традыцыйныя тэхналогіі бібліяграфічнай работы, бібліятэкі імкнуцца павысіць інфармацыйную ёмкасць кампанентаў краязнаўчага ДБА, стварыць новыя яго элементы, аптымальна прыстасаваныя для забеспячэння спецыялізаваных запытаў, дасягнуць бесперапыннага і найбольш поўнага адлюстравання дакументаў.

Найбольш грунтоўна розныя дакументы аб краі адлюстроўваюцца ва універсальных краязнаўчых картатэках, якія вядуцца фактычна ўсімі публічнымі бібліятэкамі. Краязнаўчыя картатэкі пераведзены на "Тыпавую схему класіфікацыі дакументаў для краязнаўчых каталогаў (картатэк) бібліятэк Рэспублікі Беларусь". Выяўляецца станоўчая тэндэнцыя стварэння зводных краязнаўчых картатэк.

На рост попыту карыстальнікаў на інфармацыю аб тэрыторыях адпаведнага рэгіёна, аб мясцовых ураджэнцах і дзеячах многія бібліятэкі адрэагавалі састаўленнем бібліяграфічных і фактаграфічных картатэк, напрыклад, цікавых людзей горада, народных умельцаў (Барысаўская ГЦБС і РЦБС, Мінская РЦБС, Пухавіцкая ЦБС і іншыя). У сувязі са стабільным попытам чытачоў на звесткі персанальнага і тапаграфічнага характару, прадстаўляецца своечасовым ставіць пытанне аб фарміраванні ў публічных бібліятэках акрамя сістэматычнай самастойных персанальнай і тапаграфічнай частак краязнаўчай картатэкі. Зразумела, што гэта вялікая работа, і пры гэтым таксама часткова дубліруюцца даныя з сістэматычнай часткі. Аднак вопыт тых бібліятэк, якія вядуць прапануемыя кампаненты краязнаўчай картатэкі, сведчыць аб дасягненні таго ўзроўню глыбіні, паўнаты і шматаспектнасці адлюстравання бібліяграфічных даных, іх сінтэза з фактаграфічнымі звесткамі, які надае краязнаўчай картатэцы характар грунтоўнай інфармацыйна-бібліяграфічнай базы, — надзейнай крыніцы задавальнення шматварыянтных запытаў чытачоў, інфармавання аб новых дакументах, асновы для падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў.

ЦБС неабходна прыступіць да стварэння каталогаў (картатэк) мясцовых дакументаў, якія дапамогуць адлюстраваць здабыткі выдавецкай дзейнасці ў краі.

Краязнаўчыя матэрыялы па актуальных і цікавых тэмах, аб гарадах і вёсках, людзях краю, знаходзяць шырокае адлюстраванне ў шматлікіх папках, дасье, альбомах газетных выразак. Многія бібліятэкі ствараюць фактаграфічныя картатэкі сэрвіснай, дзелавой інфармацыі. У першай групе картатэк адлюстроўваюцца матэрыялы, якія інфармуюць аб праграмах, правілах, паслугах, адрасах, тэлефонах, дзейнасці мясцовых устаноў, арганізацый, грамадскага транспарту. З дапамогай другой групы картатэк бібліятэкі імкнуцца аказаць інфармацыйную падтрымку мясцовым прадпрымальнікам. Гэтыя кампаненты ДБА патрабуюць аператыўнага адлюстравання даных, выяўленых пераважна ў мясцовым перыядычным друку, апрацоўкі аб'яў, афіш і іншых мелкалістavых дакументаў.

Відавочна, што ўзнікненне фактаграфічных картатэк звязана ў значнай ступені з дэфіцытам мясцовых даведачных выданняў, з пастаяннай цякучасцю і высокай ступенню змяненняў даных, што патрабуе іх пастаяннага адсочвання. Можна прапанаваць бібліятэкам, якія прытрымліваюцца паўнаты і сістэматычнасці ў зборы фактаграфічных даных, выступіць з ініцыятывай падрыхтоўкі мясцовых даведнікаў, шукаць дагаворы на ўдзел у іх выданні.

Разгледжаныя з'явы ў краязнаўчай бібліяграфічнай рабоце адносяцца да традыцыйнай тэхналогіі, якая прымяняецца ў большасці публічных бібліятэк. Пры аўтаматызаванай тэхналогіі (сёння яна ўкараняецца толькі ў 10 ЦБС і ахоплівае краязнаўчую бібліяграфічную работу) ствараюцца бібліяграфічныя і фактаграфічныя базы даных.

Перспектыўнасць захадаў па ўдасканаленню ДБА пацвярджаецца і пры параўнанні з аналагічным вопытам публічных бібліятэк высокаразвітых заходніх краін, для якіх інфармаванне насельніцтва аб мінулым і сучасным рэгіёна, гісторыі сем'яў і родаў, падтрымка малога і сярэдняга бізнесу, давядзенне рашэнняў мясцовай улады ўжо працяглы час з'яўляюцца прыярытэтнымі.

Важным накірункам краязнаўчай бібліяграфічнай дзейнасці



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

публічных бібліятэк у 90-ыя гады стала актыўнае састаўленне бібліяграфічных дапаможнікаў.

Пры ўсёй каштоўнасці краязнаўчых картатэк і вялікіх пошукавых магчымасцях іх недахопы — немабільнасць, немагчымасць выкарыстання па-за сценамі бібліятэкі — прымушаюць звяртацца да бібліяграфічных дапаможнікаў. Яшчэ адносна нядаўна выказваліся меркаванні аб ролі ЦБС як выкарыстальніка краязнаўчай бібліяграфічнай прадукцыі абласных універсальных навуковых бібліятэк (АУНБ), сёння публічныя бібліятэкі прымусілі пераацаніць уяўленні аб іх месцы ў падрыхтоўцы краязнаўчай бібліяграфічнай інфармацыі. Большасць ЦБС выпускаюць рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі тыпа "Што чытаць аб... горадзе (раёне)", бягучыя "Календары знамянальных і памятных дат", тэматычныя і біябібліяграфічныя паказальнікі розных відаў, тыпаў, жанраў.

Лічым, што большасць структурных звенняў сістэмы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў, абгрунтаваных для АУНБ, прымальная ва ўмовах ЦБС. Спецыфіка ЦБС абумоўлівае перавагу ў гэтай сістэме рэкамендацыйных дапаможнікаў. ЦБС буйных гарадоў у стане ажыццяўляць падрыхтоўку навукова-дапаможных бягучых і рэтраспектыўных дапаможнікаў, што мэтазгодна здзяйсняць у супрацоўніцтве з АУНБ, музеямі, архівамі, навуковымі ўстановамі і г. д.

Стварэнне дасканалага ДБА спрыяе паляпшэнню дзейнасці бібліятэк у рэжымах даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання і бібліяграфічнага інфармавання, павышэнню якасці бібліяграфічных паслуг. Справаздачы сведчаць, што на працягу года выконваюцца многія сотні краязнаўчых даведак. У многіх бібліятэках назіраецца рост колькасці краязнаўчых даведак, даведак з дадатковым уключэннем даных аб краязнаўчых дакументах і фактах. Дакладнай карціны аб колькасных характарыстыках выкананых даведак справаздачная дакументацыя ЦБС не прадастаўляе як з-за адсутнасці агульных адзіных падыходаў да ўліку даведак, так і па прычыне розных прыёмаў уліку менавіта краязнаўчых даведак. Паўната ўліку і вывучэнне чытацкіх запытаў у дадзеным рэжыме дапамаглі б бібліятэкам, па-першае, вызначыць прыярытэтныя звенні краязнаўчага ДБА і сканцэнтравацца на іх удасканаленні, па-другое, выкананне краязнаўчых даведак яскрава адлюстроўвае адмысловасць паслуг бібліятэкі, аб чым цікава і карысна ведаць мясцоваму насельніцтву і кіраўніцтву. Гэта важна паказаць пры арганізацыі рэкламы бібліятэкі.

Значную ўвагу надаюць бібліятэкі бібліяграфічнаму інфармаванню. Масавае інфармаванне здзяйсняецца ў асноўным з дапамогай бібліяграфічных паказальнікаў, спісаў, аглядаў новай краязнаўчай літаратуры, выстаў. Многія бібліятэкі праводзяць Дні краязнаўства, Дні інфармацыі.

Паступаюць даныя аб краязнаўчых дакументах і спажыўцам разнастайных форм групавога і індывідуальнага бібліяграфічнага інфармавання. У кола асноўных групавых і індывідуальных спажыўцоў краязнаўчай інфармацыі пажадана ўключаць краязнаўцаў, мясцовае кіраўніцтва, настаўнікаў, журналістаў, кіраўнікоў народных мастацкіх калектываў, дзелавых людзей.

Якасць краязнаўчых бібліяграфічных прадуктаў і паслуг непасрэдна залежыць ад падрыхтаванасці бібліятэкараў-бібліёграфаў да гэтай дзейнасці. Патрабаванні да бібліёграфа-краязнаўцы асабліва высокія: акрамя прафесіянальных ведаў яму неабходны глыбокія веды аб сваім краі па ўсяму комплексу краязнаўства, натхненне да пастаяннага пошуку і даследаванняў. Адкрыццё ў Беларускім універсітэце культуры падрыхтоўкі кадраў па дадзенай спецыялізацыі ў будучым дапаможа публічным бібліятэкам вырашыць кадравае пытанне. На наш погляд, актыўнае развіццё інфармацыйнай функцыі ЦБС прывядзе да стварэння ў цэнтральных бібліятэках самастойных бібліяграфічных аддзелаў, структурных краязнаўчых падраздзяленняў.

## НАШИ КОНСУЛЬТАЦИИ

***1. Какими документами регламентируется работа библиотечных работников по гибкому графику? Имеет ли директор право его отменить?***

Деятельность библиотеки осуществляется в соответствии с внутренним распорядком, утверждаемым директором библиотеки. В нем оговариваются условия использования сотрудниками гибкого графика. Такое право имеют только работники внутрибиблиотечных подразделений. Не имеют права пользоваться гибким графиком администрация библиотеки, заведующие отделами, сотрудники отделов книгохранения и обслуживания.

В случае нарушения сотрудником условий работы по гибкому графику директор библиотеки имеет право его отменить.

*В.А.Шишкин,*
*заместитель начальника управления учреждений культуры и народного творчества Министерства культуры Республики Беларусь*

***2. За выполнение каких видов работ в библиотеке положены доплаты, сокращенный рабочий день, дополнительный отпуск и другие льготы?***

Работникам, владеющим иностранными языками и применяющим их в практической работе, устанавливаются надбавки к должностным окладам в следующих размерах: за один язык — до 13 % от ставки первого разряда; за два и более языков — до 16 % от ставки первого разряда.

В случае производственной необходимости устанавливается доплата за расширение зоны обслуживания специалистам и служащим в размере до 50 процентов оклада (ставки) по совмещаемой должности.

Работа по совместительству разрешена рабочим и служащим на том же или другом предприятии, в учреждении и организации в свободное от основной работы время. Продолжительность работы по совместительству не может превышать четырех часов в день и полного рабочего дня в выходной день. Общая продолжительность работы по совместительству в течение месяца не должна превышать месячной нормы рабочего времени.

По соглашению между работником и нанимателем может устанавливаться как при приеме на работу, так и впоследствии неполный рабочий день или неполная рабочая неделя. По просьбе беременной женщины, женщины, имеющей ребенка в возрасте до четырнадцати лет (в том числе находящегося на ее попечении) или осуществляющей уход за больным членом семьи в соответствии с медицинским заключением, наниматель обязан устанавливать ей неполный рабочий день или неполную рабочую неделю.

Оплата труда в этих случаях производится пропорционально отработанному времени или в зависимости от выработки.

Работа на условиях неполного рабочего времени не влечет для работников какихлибо ограничений продолжительности ежегодного отпуска, исчисления трудового стажа и других трудовых прав.

На дополнительный отпуск (12 дней) имеют право инженерно-технические работники (химик и энтомолог научно-исследовательской лаборатории отдела гигиены и реставрации книг).

Льготы имеют работники, совмещающие работу с обучением (КЗОТ Республики Беларусь, статьи 187 — 204).

*Н.Г.Алексеева,*
*главный экономист экономического управления Министерства культуры Республики Беларусь,*
*В.С.Горелько,*
*главный юрисконсульт отдела юридической и кадровой работы Министерства культуры Республики Беларусь*

***3. Какими налогами и в каком объеме облагается деятельность библиотек?***

Согласно действующему законодательству библиотеки уплачивают следующие налоги и сборы:

за счет бюджетных средств — плата за землю;

по доходам, полученным от хозяйственной и коммерческой деятельности: налог на прибыль (30 % от суммы превышения доходов над расходами), чрезвычайный налог (8 % от фонда оплаты труда), налог на добавленную стоимость, отчисления во внебюджетный фонд поддержки производителей сельхозпродукции и продовольствия (1 % от выручки), отчисления во внебюджетный фонд для финансирования расходов на содержание ведомственного жилищного фонда (0,25 % от выручки), отчисления в дорожный фонд (1 % от выручки, за исключением арендной платы).

Следует также отметить, что при расчетах за выполненные сторонними организациями для библиотек работы и услуги, которые оплачиваются за счет бюджетных средств, в стоимость работ включаются — налог на добавленную стоимость (20 %), чрезвычайный налог (8 % от фонда оплаты труда), отчисления в республиканский внебюджетный фонд поддержки производителей сельхозпродукции и продовольствия (1 % от выручки), отчисления во внебюджетный фонд для финансирования расходов на содержание ведомственного жилищного фонда (0,25 % от выручки), отчисления в дорожный фонд (1 % от выручки).

*Л.В.Сасункевич,*
*главный экономист экономического управления Министерства культуры Республики Беларусь*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ